Бярэйшык, Л. У. Музеялогія ў сістэме міждысцыплінарнасці /Л. У. Бярэйшык //Этнокультурное развитие Беларуси в XIX – начале XXI в.: материалы междунар. науч.-практ. конф. / редкол. : Т. А. Новогродский (отв. ред.) [и др.]. — Минск: БГУ, 2011. — С. 229 – 235

**Л. У. БЯРЭЙШЫК**

# МУЗЕЯЛОГІЯ Ў СІСТЭМЕ МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНАСЦІ

Месца музеялогіі ў сістэме навук яшчэ не дастаткова вызначана. Па сённяшні дзень навукоўцы разыходзяцца ў поглядах на прадмет пазнання музеялогіі, яе метадах, мовы і сістэмы. Як адзначае аўстрыйскі музеёлаг Ф. Вайдахер: « Музеялогія мае інтэгратыўную прыроду і звязана з дасягненнямі іншых навук. Яна разглядае ўсе пытанні самарэфлексіі, гісторыі, тэорыі ды практыкі, паколькі яны актуальныя для ўсіх форм выяўлення музеальнага феномена. Агульная музеялогія патрабуе інтэрдысцыплінарнай дапамогі сумежных навук для даследавання асноўных з'яў у грамадстве і прыродзе». Тым не менш, музеялогія – незалежная навуковая дысцыпліна, якая мае справу з працэсам музеялізацыі, або эпістэмалагічна-аксіалагічным асваенні рэчаіснасці. Інтэрдысцыплінарны характар гэтай фарміруючайся дысцыпліны абумоўлены перш за ўсё тым, што профілі музеяў звязаны практычна з усімі галінамі ведаў, у музеі ажыццяўляецца разнастайны спектр практычнай дзейнасці. І сёння для работы ў музеі патрабуюцца добра падрыхтаваныя спецыялісты, інтэлектуалы з шырокім колам інтарэсаў.

Музеялогія – тэрмін адносна малады, але перадгісторыя развіцця дадзенай навукі пачынаецца ў больш ранні перыяд. Гісторыя калекцыяніравання, станаўлення і развіцця музея будавалася на асваенні ім новых галін сацыяльнай практыкі. Гэта асваенне вяло да з'яўлення разнастайных музеяў, узбагачала гістарычную тыпалогію музеяў. Мяняліся ўяўленні аб музеі як сацыякультурным інстытуце. Эвалюцыя музея ўносіла змены і ў прыемы музеефікацыі, у характар музейнай камунікацыі. Усё гэта спрыяла ўзбагачэнню інструментарыя музейнай навукі, паступовым зменам яе структуры і склада, а таксама месца музеязнаўства ў пазнанні. Падвяргаліся карэктыроўцы цэнтральныя паняцці дадзенай дысцыпліны: помнік, культурная спадчына, культурны набытак, музейны прадмет, музейны фонд і інш. Часцей за ўсё назіралася тэндэнцыя да больш шырокай трактоўкі гэтых катэгорый.



Першыя крокі музейная навука зрабіла ў эпоху Адраджэння, калі склалася агульнае ўяўленне аб культурнай спадчыне і яна асацыіравалася з рарытэтамі Высокай культуры і прыроды. У практычным вопыце калекцыянераў намецілася тэндэнцыя дыферэнцыяцыі формаў захавання і прэзентацыі розных відаў помнікаў. А самая ранняя тэарэтычная работа ў галіне музейнай справы была выдадзена ў 1565 г. у Мюнхене бельгійскім доктарам Самуэлем фон Кічбергам, у якой ён упершыню выказвае ідэю аб стварэнні правіл групоўкі матэрыялаў. На яго думку калекцыі павінны ўяўляць сабой сістэматызаваную класіфікацыю ўсіх матэрыялаў, якія сустракаюцца ў прыродзе. Непасрэдным заснавальнікам музейнай тэорыі можна лічыць Йохана Даніэля Майора, які ў кнізе, што убачыла свет у Кіле ў 1674 г., робіць спробу азначэння музейнага прадмета. У 1727 г. Ф. Нейкеліўс у выдадзенай кнізе ў Лейпцыгу ўпершыню ўводзіць у навуковы зварот тэрмін «музеяграфія» і робіць спробу класіфікаваць склаўшыяся да таго часу тыпы музеяў. Такім чынам, першыя музейныя тэарэтыкі імкнуліся стварыць пэўныя схемы групоўкі музейных калекцый, забяспечыць іх захаванне і прэзентацыю.

Істотныя змены ў сацыяльнай місіі музея адбываліся ў эпоху Асветы. Швабскі пратэстанцкі святар Й. Андрэс у 1619 г. у працы, надрукаванай у Страсбургу, звяртаў увагу на тое, што для асветы і навуковых даследаванняў недастаткова адных толькі кніжак, а таму патрэбна выкарыстанне спецыяльных калекцый аўтэнтычных аб'ектаў. У той час многія музейныя зборы фарміруюцца дзеля патрэб развіваючыхся рацыянальных ведаў, разглядаюцца як неабходны матэрыял для даследаванняў. Стваралісся універсітэцкія музеі, якія па складу калекцый былі пераважна прыродазнаўча-гістарычнымі і выкарыстоўваліся пры выкладанні прыродазнаўчай гісторыі. Пры кафедрах меліся прыродазнаўчыя кабінеты са змешаным складам калекцый – ад прадметаў прыродазнаўчага паходжання да прадметаў мастацтва. Ва універсітэцкай адукацыі музейныя экспанаты былі своеасаблівымі крыніцамі для вывучэння, перш за ўсё, прыродных з'яў і працэсаў. Першы такі вопыт быў створаны музеем Оксфардскага універсітэта, які ўзнік у 1683 г. Яго практыка паклала пачатак фарміраванню новай сацыяльнай функцыі музея як адукацыйнага інстытута. У Расіі першы універсітэцкі музей узнік у 1759 г. у форме кабінета «натуралиеў», а ў Беларусі – музей Гродзенскай медыцынскай акадэміі ў 1775 г. Бытаванне такіх музеяў заклала падмурак для узнікнення не толькі музеяў навучальных устаноў, але і профільных музеяў, звязаных з рознымі галінамі ведаў. Можна сказаць, што ва універсітэце, з яго цеснай

узаемасувяззю навукі і адукацыі, пачынае складвацца агульная схема узаемаадносін розных навуковых галін і музея.

Узнікненне профільных музеяў, прадметна-арыетаваных музеяў спрыяла далейшаму развіццю ўзаемаадносін навукі і музея. Музеі давалі прадметным ведам асноўны фактаграфічны падмурак, а навука стварала нарматыўна-метадычную аснову для галоўных накірункаў музейнай дзейнасці. Менавіта ў профільных музеях канчаткова аформілася першапачатковая структура музеялогіі і яе статус як прыкладной дысцыпліны, якая прызвана абслугоўваць розныя накірункі прадметных ведаў.



З канца XVIII ст. вучоных хвалюе думка аб месцы і ролі музея ў грамадстве і культуры, аб стварэнні нацыянальнага музея. Рабіліся першыя тэарэтычныя абагульненні, распрацоўваліся асобныя дэфініцыі, адбывалася станаўленне навуковай методыкі асноўных накірункаў музейнай дзейнасці. У першай палове XIX ст. прасочваюцца спробы адлюстраваць гісторыю развіцця музейнай тэорыі і музея. Да рэчы згадаць Густава Клема («Гісторыя збораў навукі і мастацтва ў Германіі», Цэрбст, 1837), які апісаў тэарэтычныя працы, склаў дакладную бібліяграфію, а таксама Луі Віардо, які ў працы «Les muse d'Europe» (Парыж, 1860) паведамляе пра развіццё музейнай справы ў найважнейшых еўрапейскіх дзяржавах. У 1878 г. выйшаў у свет першы перыядычны часопіс «Zeitschrift für Museologie, und Antikitätenkunde», заснавальнікам якога быў дырэктар знакамітых дрэздэнскіх музеяў Й. Г. Грэсэ. У артыкуле «Музеялогія як навука», надрукаваным у 1883 г., ён упершыню ўводзіць у зварот тэрмін «музеялогія», азначае даследчы патэнцыял гэтай галіны ведаў і робіць спробу зацвердзіць яе як новую навуковую дысцыпліну. Музеязнаўчыя перыядычныя выданнні пачалі выходзіць і ў іншых краінах: у 1895 г. у Чэхаславакіі («Веснік чэхаславацкіх музеяў і археалагічных таварыстваў») і ў ЗША «The Museum», а таксама ў 1902 г. у Вялікабрытаніі – «Museum Journal» як друкаваны орган брытанскай Музейнай асацыяцыі ў Лондане з карэспандэнтамі ў Германіі, ЗША, Аўстраліі, Паўднёвай Афрыцы і Новай Зеландыі.

Надзвычайна вялікая роля ў станаўленні музеязнаўчай думкі адводзіцца перыяду 1910–1920-х гг. Развіццё розных накірункаў музейнай дзейнасці стымулявала абагульненне практычнага вопыту. У 1924 г. у часопісе «Museumskunde» Карл Кьётшаў пісаў, што «паняцце «музеязнаўства» набыло прызнанне і таму можна весці размову пра дысцыпліну, якая займае сціплае месца ў вялікай сістэме нашай духоўнай дзейнасці, прыйшоў час на абагульненне зробленага. Іншымі словамі, гэта дысцыпліна, што зараз развіваецца, мае права прэтэндаваць на дапаможнік музеязнаўства». На базе практыкі школьных і дзецкіх музеяў у пачатку XX ст. была сфармулявана новая канцэпцыя вучэбнага музея, метады працы музея з навучэнцамі. Усё гэта прывяло да глыбокіх змен у іх практычнай дзейнасці, а потым у метадалогіі і тэорыі, дало штуршок да трансфармацыі музеязнаўства з прыкладной дысцыпліны ў музеялогію як міждысцыплінарны накірунак у пазнанні. Фарміраванне новага статуса музейных ведаў было звязана з зараджэннем музейнай педагогікі – сумежнай дысцыпліны, звернутай да наведвальніка як ключавой фігуры музейнай камунікацыі. Яна прывяла да істотных змен у поглядах на музей як сацыяльны інстытут, галоўным клопатам якога становіцца не фонд, а наведвальнік, а галоўным накірункам музейнай дзейнасці – музейная камунікацыя. Пачатак распрацоўкі тэарэтычнага падмурка гэтай дысцыпліны зыходзіць да работ нямецкіх педагогаў-рэфарматараў Ф. Гансберга, Р. Гільдэбрандта, Л. Гурліта, А. Ліхтварка і інш. Першапачаткова музейная педагогіка разглядалась як дысцыпліна, якая абагульняе метады працы з падрастаючым пакаленнем, але паступова яе аб'ект і прадмет пачалі разглядацца больш шырока. Сёння музейная педагогіка займаецца распрацоўкай метадаў музейнай



камунікацыі ў дачыненні да наведвальнікаў розных узроставых катэгорый, сацыяльных груп, рознага ўзроўню ведаў, прафесійных інтарэсаў, схільнасцей і інш.

У другой палове XX ст. праблемам музеялогіі надавалася значная ўвага ў міжнародных навуковых колах. Назіралася ўзаемапранікненне ідэй, канцэпцый заходнееўрапейскай, амерыканскай і ўсходнееўрапейскай музеелагічных школ, што дало новы штуршок развіццю навукі як за мяжой, так і у нашай краіне. Дыскусіі пра асноўныя праблемы музеялогіі працягваліся на больш шырокай падставе пасля заснавання ў 1946 г. Міжнароднага савета музеяў (ICOM), які адыграў важнейшую ролю ў самаідэнтыфікацыі музеязнаўства як самастойнай дысцыпліны. У Еўропе і Амерыцы праводзіліся шматлікія канферэнцыі, сімпозіумы, семінары. На Генеральнай канферэнцыі Міжнароднага савета музеяў у 1971 г. музеялогія была прызнана навучальнай дысцыплінай. На XI Генеральнай канферэнцыі ICOM у 1977 г. па ініцыятыве Яна Ялінека, дырэктара Мараўскага музея (Брно, Чэхаславакія), прэзідэнта ICOM у 1971–1977 гг., быў створаны Міжнародны камітэт па музеялогіі (International Committee for Museology,

скарочана – ICOFOM), які ён узначальваў да 1983 г. У задачу камітэта ўваходзіла аб’яднанне намаганняў навукоўцаў розных краін з мэтай даследавання, вывучэння і распаўсюджвання тэарытычных асноў музеязнаўства як самастойнай навуковай дысцыпліны, садзейнічаць крытычнаму аналізу асноўных тэндэнцый у музеязнаўстве. Камітэтам было прапанавана ўключыць дадзеную дысцыпліну ў вучэбныя планы універсітэтаў свету. Штогод ICOFOM ладзіць навуковыя і акадэмічныя сустрэчы ў розных краінах з мэтай забеспячэння абмену паміж прафесіяналамі ўсяго свету, камітэт стаў галоўнай міжнароднай платформай для дыскусій пра статус музеязнаўства. Так, у розныя гады тэмамі былі «Музеялогія і музеі», «Музеялогія і развіцце краін», «Музеі і захаванне спадчыны», «Музеелагічныя даследаванні», «Музеялогія і глабалізацыя» і інш.

На першым этапе дзейнасці ICOFOM праводзілася інвентарызацыя і першапачатковая уніфікацыя паняційнага (даведачнага) апарата музеязнаўства, што забяспечвала ўзаемаразуменне паміж даследчыкамі розных краін. Асноўная дыскусія разгарнулася ўкола ключавых прадстаўленняў пра прадмет, метад, структуру музеязнаўства, яго месца ў сістэме навук. Ужо ў 1977 г. камісія па музеялогіі сумесна з Міжнародным камітэтам дакументацыі і Цэнтральным інстытутам музейнай справы ў Будапешце стварылі спецыяльную рабочую групу «Тэрміналогія», якая ўклала на дваццаці мовах параўняльны музеялагічны слоўнік, выдадзены ў 1986 г. (Dictionarium Museologicum, Budapest). Чарговы этап працы над дадзеным праектам наступіў у 2008 г., калі на чарговай канферэнцыі была вызначана структура новага «Энцыклапедычнага слоўніка музеязнаўства», абмеркаванне якога адбылося на XXII Генеральнай канферэнцыі ІКОМ у лістападзе 2010 г. Аб сваёй дзейнасці сабраў багатую бібліяграфічную калекцыю па музеялогіі праз свае выданні (Study Series (ISS), часопіс «Museological Working Papers» і інш.), якія абагульняюць вопыт станаўлення новай дысцыпліны.

Змены культурнай парадыгмы пасляваеннага часу, істотны перагляд сістэмы каштоўнасцей спрыялі развіццю культуры паўсядзеннасці. Па сваёй прыродзе яна



звязана з радавым чалавекам, яго жыццём, клопатамі і сістэмай каштоўнасцей. У гэтых умовах імкліва мянялася ўяўленне пра культурную спадчыну. У канцы 1960-х – пачатку 1970-х гг. зараджаецца рух за «новую музеялогію», які праявіўся ў стварэнні новага музея – экамузея і стаў пратэстам супраць кансерватыўнага падыходу большасці музейных устаноў да вырашэння пытанняў этнакультурнага, сацыльнага і палітычнага развіцця, з іх недастатковай актыўнасцю і дрэннай камунікацыяй, у нежыццяздольнасці прапанаваных музееведамі рэформаў, адмова ад эксперыментаў і ўдзела ў сацыяльным жыцці акругі. Новая музеялогія – нешта большае, чым рух, яна прызваная садзейнічаць пошуку новага ў музейнай справе, мабілізуе прыхільнікаў радыкальнага перагляду мэт музеялогіі і выступае за карэнныя змены ў псіхалогіі і поглядах музейных супрацоўнікаў. Асновы новых падыходаў былі закладзены ў 1972 г. на Міжнародным семінары па праблемах абшчынных музеяў у Санцьяга (Чылі). Станаўленню «новай музеялогіі» як самастойнага раздзела музейнай навукі важнейшую ролю адыграў міжнародны семінар «Экамузеі і новая музеялогія» у Квебеку (Канада, 1984 г.). Асноўныя мэты, прынцыпы новага накірунка былі закладзены ў Квебекскай дэкларацыі. У ёй адзначаецца, што ў сучасным свеце, які імкнецца выкарыстаць усе сродкі для свайго развіцця, музеі павінны выйсці за межы традыцыйных задач і функцый: ідэнтыфікацыі, кансервацыі і асветы, і перайсці да ажыццяўлення больш шырокіх праграм, якія дазваляюць ім актыўна ўдзельнічаць у жыцці грамадства і паўней інтэгрыравацца ў акружаючае асяроддзе. Каб дасягнуць гэтага і ўцягнуць наведвальнікаў у сваю дзейнасць, музеі ўсё часцей пачалі звяртацца да прынцыпа міждысцыплінарнасці, да выкарыстання ў культурна-асветніцкай дзейнасці навейшых метадаў камунікацыі і сучасных форм работы з насельніцтвам.

Згадаем, што радзімай «новай музеялогіі» стала Францыя, а яе заснавальнікамі Ж. А. Рыўер і Ю. дэ Варын. Яны былі аўтарамі буйных музейных праектаў у сябе на радзіме, удзельнікамі праектаў інтэгрыраваных музеяў лацінаамерыканскіх краін, Канады і іншых рэгіёнаў. Тэарэтычныя абагульненні практычнага вопыта дазволілі Ж. А. Рыўеру вызначыць прыкметы экамузея, сфармуляваць асноўныя палажэнні «новай музеялогіі». У яго разуменні, экамузей – своеасаблівая лабараторыя па распрацоўцы метадаў удасканалення адносін паміж чалавекам і яго асяроддзем і прадастаўленню матэрыялаў для ілюстрацыі мінулага і сучаснасці пэўнай тэрыторыі; запаведнік, які садзейнічае захаванню прыроднай і культурнай спадчыны; своеасаблівая школа, якая ўцягвае мясцовых жыхароў у дзейнасць па захаванню традыцый, творчаму пераасэнсаванню сучаснасці і прагназаванню сваёй будучыні, якая праводзіць сярод іх культурна-адукацыйную дзейнасць, а таксама рыхтуе спецыялістаў па захаванню спадчыны. Юг дэ Варын у 1971 г. прапанаваў называць ствараемыя музеі пад адкрытым небам – экамузеямі.

У адрозненні ад традыцыйных (профільных) музеяў экамузей шматпрофільны і таму апіраецца на міждысцыплінарны падыход. У ім значна зменены ўяўленні пра музейны прадмет, музейную прастору, спадчыну. Музейным экспанатам там з’яўляецца тэрыторыя, калектыўная памяць і ўмельства, у тым ліку ў непрадмет-

ных формах бытавання культуры (фальклор, музычнае, танцавальнае мастацтва, гістарычных тэхналогій, абрадаў і інш.).

За апошнія сорак гадоў экамузеі атрымалі шырокае распаўсюджванне ў розных краінах і нават на розных кантынентах: у Еўропе, Паўднёвай і Паўночнай Амерыцы. Іх актыўныя формы работы з насельніцтвам (тэатрпалізацыя, стварэнне школ рамёстваў па асваенню гістарычных тэхналогій і інш.), выкарыстанне нематэрыяльнай спадчыны пачалі шырока выкарыстоўвацца і традыцыйнымі (класічнымі) музеямі. Канадскі музеёлаг П. Мейран адзначыў, што «новая музеялогія аперыруе такімі паняццямі, як абшчынная музеялогія, міждысцыплінарнасць, развіццё чалавека... Яе філасофскія прынцыпы – сацыялізацыя музеялогіі і змяненне падыходаў».

Актыўная сацыяльная місія сучасных музеяў, арыентаваных на чалавека, прывяла да пашырэння тыповай і відавай іх разнастайнасці ад класічных музеяў калекцыйнага тыпу да музеефікаваных тэрыторый. Розныя музеі выкарыстоўваюць інструментарый прыродазнаўчых, гуманітарных і дакладных навук. Таму спецыфічнай характарыстыкай гэтага з’яўляецца інтэрдысцыплінарнасць (ці міждысцыплінарнасць).

Як адзначалася вышэй, сутнасць міждысцыплінарнасці музеязнаўства заключаяцца ў яе глыбінных сувязях з іншымі навукамі. Абумоўлена гэта тым, што профілі музеяў звязаны практычна з усімі галінамі ведаў – прыродазнаўствам (геалогія, мінералогія, заалогія, біялогія, палеанталогія), гісторыяй, мастацтвазнаўствам, літаратуразнаўствам і інш. Таму для спецыяльнага музеязнаўства характэрна пераважнае выкарыстанне метадаў профільных і дапаможных гістарычных навук. Шырокі спектр практычнай дзейнасці музеяў цесна звязаны з педагогікай, сацыялогіяй, інфармацыйна-кампьютарнымі тэхналогіямі, кансервацыяй і рэстаўрацыяй, маркетынгам і г. д. Міждысцыплінарныя сувязі музеязнаўства з іншымі навукамі дазваляюць творча выкарыстоўваць іх прадметы і метады даследавання.

Даследаванні ў галіне агульнага музеязнаўства скіраваны не толькі на абагульненне гісторыі, тэорыі і практыкі музейнай справы, але і на філасофскае асэнсаванне музея і яго ролі ў постіндустрыяльным грамадстве, на вывучэнне спецыфічных музейных адносін чалавека да рэчаіснасці. Філасофскія падыходы з’яўляюцца тэарэтычным і метадалагічным падмуркам для вызначэння місіі і мэт музея, стварэння яго канцэпцыі, для асэнсавання ўсіх накірункаў яго дзейнасці, для інтэрпрэтацыі музейных збораў з пункту гледжання іх гісторыка-культурнай каштоўнасці. У канцы мінулага стагоддзя ў музеязнаўстве назіраліся змены, звязаныя з укараненнем філасофскай парадзігмы, арыентаванай на вывучэнне чалавека ва ўсіх разнастайных яго адносінах з цывілізацыяй, грамадствам, сям’ёй.

Важным з метадалагічнага пункту гледжання для музеялогіі з’яўляецца культуралагічны падыход, які арыентуе на разгляд умоў, абставін ці мэт стварэння музейнага прадмета, яго ролі ў прыродзе і грамадстве ў свой час, значнасці ў кантэксце дадзенай культуры.



Інтэрдысцыплінарныя сувязі паміж музеязнаўствам і псіхалогіяй прасочваюцца пры вывучэнні асаблівасцей успрымання інфармацыі, акумуліраванай у музейных прадметах, сродкамі агульнай псіхалогіі і псіхалогіі асобы. Музеялогія мае цесныя сувязі з педагогікай і сацыялогіяй, якія дапамагаюць музею рэалізаваць яго адукацыйныя функцыі. Узаемадзеянне музеяў з сістэмай адукацыі неабходна для задавальнення патрабаванняў разнастайнай аўдыторыі, у тым ліку для вырашэння праблем самаадукацыі і самарэалізацыі, сацыяльнай адаптацыі і культурнай ідэнтыфікацыі. Усё гэта прывяло да таго, што ў структуры ранейшага музеязнаўства акрамя музейнай педагогікі з’віліся музейная псіхалогія і музейная сацыялогія.

Выкарыстанне музейнай навукай метадаў дакладных дысцыплін, перш за ўсё, ідзе па лініі ўкаранення інфармацыйных тэхналогій. Самастойным раздзелам музеязнаўства стала музейная інфарматыка. Сёння музеі актыўна рэалізуюць праграмы па кампьютэрызацыі фондавай работы, стварэнню мультымедыйных прадуктаў для адукацыйных і асветніцкіх праграм. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій аблегчыла індывідуальны доступ да музейных калекцый.

Далейшае развіццё музеязнаўства, як лічаць многія навукоўцы, будзе вызначацца «дыфузіяй» профільных і сумежных навук, што ўжо сёння прывяло да з’яўлення музейнага крыніцазнаўства, музейнага дызайна, музейнага менеджмента і маркетынга і г. д.

Яскрава выражаная міждысцыплінарнасць музеязнаўства і яе цесная ўзаемасувязь з іншымі навукамі вызначае змест і межы канцэпцыі музеязнаўчай адукацыі на гістарычным факультэце БДУ.

**ЛІТАРАТУРА**

1. *Вайдахер, Ф.* Загальна музеологія: пособнік / Перакл. з ням. В. Лозиньский, О. Лянг,Х. Назаркевич / Ф. Вайдахер. – Львів : Літопис, 2005. – 634 с.
2. *Мейран, П.* Новая музеология / П. Мейран // Museum. 1985. № 148. С. 20–23.
3. *Сотникова, С. И.* Музеология / С. И. Сотникова. – М. : Дрофа, 2004. – 192 с.
4. *Сотникова, С. И.* Музеология как междисциплинарное знание / С. И. Сотникова // Музейные фонды і экспозіція в научно-образовательном процессе: Матеріалы Всероссійской научной конференціі // http://museolog. rsuh. ru/sotnikova. html
5. *Мастеница, Е. Н.* Интердисциплинарность музееведения и ее отражение в концепции музееведческого образования / Е. Н. Мастеница // Музейное образование. История и современные концепции. Сб. материалов Всероссийской научно-практической конференции, 18–19 апреля 2002. / Санкт-Петербургский гос. ун-т культуры и искусства. – СПб. : СПбГУКИ, 2004. – С. 41–46.
6. *Скривен, С. Г.* США: становление науки / С. Г. Скривен // Museum. 1993. С. 6–12.
7. *Стронг, Р.* Музей и коммуникация / Р. Стронг // Museum. 1983. № 138.
8. *Ривьер, Ж. А.* Эволюционное определение экомузея / Ж. А. Ривьер // Museum. 1985. № 148. С. 2–3.